ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
1
ВЕРАСНЯ
ЧАЦВЕР
№ 24 (1400)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## ДАРАГІЯ СЯБРЫ! ВІНШУЕМ З ПАЧАТКАМ НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА!




## ПРАНЯСІЦЕ ПРАЗ ГАДЫ ПРАГУ ДА ВЕДАЎ І ПОШУКУ

ДАРАГІЯ ПЕРШАКУРСНІКІ! Прайшло ўсяго некалькі дзён, як закончыліся ўступныя экзамены. Вы з гонарам іх вытрымалі і заслужылі права вучыцца ў Беларускім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна. Сардэчна віншую вас з высокім званнем савецкага студэнта і жадаю поспехаў у вучобе, грамадскай дзейнасці на карысць нашай Радзімы.

Вы папоўнілі універсітэцкую сям'ю, у ёй вы будзеце на працягу пяці непаўторных і радасных год, вам развіваць традыцыі флагмана вышэйшай школы рэспублікі, памнажаць яго поспехі. Таму пажадана пазнаёміць вас з нашым — а цяпер ужо і вашым — універсітэтам.

Сёння ва універсітэце вучыцца каля васемнаццаці тысяч студэнтаў. З іх толькі на дзённым аддзяленні звыш дзесяці тысяч. Кожны год на змену амаль чатыром тысячам выпускнікоў прыходзіць новае пакаленне юнакоў і дзяўчат. Іх запрашаюць у свае аўдыторыі, вучэбныя кабінеты і лабараторыі 12 факультэтаў. У нас шырокая агульнаадукацыйная аснова спалучаецца з глыбокімі фундаментальнымі ведамі. Увесь вучэбны працэс непарыўна звязаны з даследчай работай, якой актыўна займаюцца больш як восемдзесят працэнтаў студэнтаў дзённага аддзялення. Універсітэцкая адукацыя асабліва каштоўная тым, што яна, як ніякая іншая, дазваляе спецыялісту хутка арыентавацца ў навуковай праблематыцы, быць на пярэднім краі навукова-тэхнічнага прагрэсу. І мы ганарымся сваімі выпускнікамі. Яны ўносяць істотны ўклад у развіццё навукі, культуры, ва ўсе галіны народнай гаспадаркі рэспублікі. Многія з іх сталі вядомымі партыйнымі і дзяржаўнымі дзеячамі, выдатнымі вучонымі, пісьменнікамі, работнікамі асветы і культуры, вядучымі спецыялістамі розных галін народнай гаспадаркі.

Адказныя, складаныя задачы стаяць перад вамі, дарагія першакурснікі. Краіне патрэбны спецыялісты, як падкрэслівалася на чэрвеньскім Пленуме ЦК КПСС, якія добра авалодалі асновамі марксісцка-ленінскага вучэння, у дасканаласці ведаюць сваю спецыяльнасць, здольны пастаянна абагачацца новымі ведамі.

Дапамагаць авалодваць ведамі вам будуць нашы высокакваліфікаваныя выкладчыкі. Ва універсітэце вучэбны працэс забяспечваюць сто пяць кафедр, на якіх працуе сто сорак пяць дактароў навук, прафесараў, у тым ліку сорак сем акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў Акадэміі навук СССР і БССР, больш як 900 дацэнтаў і кандыдатаў навук, сорак лаўрэатаў Ленінскіх і Дзяржаўных прэмій.

Удасканаленне ўсёй дзейнасці Беларускага дзяржаўнага універсітэта праходзіць у святле пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў». У пастанове запісана, што галоўная ўвага вышэйшай школы павінна быць сканцэнтравана на ўсебаковым паляпшэнні якасці прафесійнай падрыхтоўкі і ідэйна-палітычнага выхавання спецыялістаў, умацаванні сувязі з вытворчасцю, практыкай камуністычнага будаўніцтва.

Мы ставім задачу, каб кожны студэнт набыў навыкі даследчыка, аналітычна падыходзіў да вырашэння складаных задач. У нас створаны ўсе ўмовы для навукова-даследчай работы. Актыўна дзейнічаюць студэнцкія навуковыя таварыствы і гурткі пры кафедрах, студэнцкія лабараторыі, канструктарскія бюро. Праводзяцца конкурсы, агляды, выстаўкі студэнцкай навуковай творчасці. Удзяляецца вялікая ўвага ўдзелу студэнтаў у так званых рэальных даследаваннях, якія праводзяць навуковыя калектывы кафедр і лабараторый. У выніку многія студэнцкія работы ўдастойваюцца розных прэмій і ўзнагарод.

Рэктарат удзяляе вялікую ўвагу ўдасканальванню вучэбнага працэса, яго тэхнічнаму аснашчэнню. Аўдыторыі, лабараторыі папаўняюцца сучасным абсталяваннем, электронна-вылічальнымі прыстасаваннямі. Шырока прымяняюцца навейшыя фізіка-хімічныя прылады, якія знаходзяцца ў комплексе з вымяральна-вылічальнымі сістэмамі.

З мэтай далейшага паляпшэння падрыхтоўкі спецыялістаў будзе расшырацца і ўмацоўвацца творчае супрацоўніцтва універсітэта з прадпрыемствамі, навукова-даследчымі інстытутамі, іншымі арганізацыямі. Атрымае далейшае развіццё і такая форма сувязі, як галіновыя лабараторыі, якія фінансуюцца адпаведнымі міністэрствамі і ведамствамі і ствараюцца для вырашэння канкрэтных навуковых праблем. Будуць стварацца філіялы кафедр непасрэдна ў акадэмічных інстытутах і навукова-вытворчых аб'яднаннях. Гэта дазволіць наблізіць падрыхтоўку спецыялістаў да вытворчасці, загадзя іх размяркоўваць.

Мы плануем расшырыць і палепшыць падрыхтоўку спецыялістаў па такіх перспектыўных тэхнічных напрамках, як кібернетыка, робататэхніка, мікраэлектроніка, аўтаматызаванае праектаванне ў машынабудаванні, сістэмнае праграміраванне і лагічнае праектаванне ЭВМ, плазменная і іённапрамянёвая тэхналогія, хімія і электрахімія пакрыццяў.

Усе гэтыя тэхналагічныя напрамкі базіруюцца на дасягненнях розных навук і патрабуюць для свайго развіцця спецыялістаў — інжынераў з высокім узроўнем фундаментальных ведаў у галіне матэматыкі, фізікі, хіміі, што найбольш поўна забяспечваецца праграмай універсітэцкай адукацыі.

Ва універсітэце ўжо зроблена шмат для падрыхтоўкі такіх спецыялістаў. Наступным крокам у гэтым напрамку будзе стварэнне новых кафедр, такіх, як матэматычнае забеспячэнне робататэхнічных сістэм, аўтаматызацыя праектавання, атамная фізіка, хімія цвёрдага цела і паўправаднікоў.

Асаблівая ўвага будзе ўдзелена паляпшэнню падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне эканомікі, аховы і рацыянальнага выкарыстання навакольнага асяроддзя. Намячаецца ўвесці такія спецыяльнасці, як арганізацыя кіраўніцкай працы,

(Заканчэнне на 2-й стар.).

# Пранясіце праз гады прагу да ведаў і пошуку

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

эканамічная кібернетыка і псіхалогія, геамарфалогія, геаграфія глеб і глебазнаўства, аналітычны кантроль і ахова навакольнага асяроддзя.

Работа па паляпшэнню сістэмы спецыялізацыі закране і гуманітарныя факультэты. Будуць уведзены спецыялізацыі па навуковаму камунізму, гісторыі сацыялістычнага будаўніцтва ў зарубежных краінах, следчай крыміналістыкі, зарубежнай журналістыкі, рэдагаванню масавай літаратуры і іншыя.

Больш увагі будзе ўдзелена паляпшэнню падрыхтоўкі настаўнікаў для сярэдніх школ і тэхнікумаў. Паявяцца новыя кафедры метадычнага напрамку і тэхнічных сродкаў навучання на механіка-матэматычным, фізічным і хімічным факультэтах.

На фізічным факультэце будуць створаны два навуковыя цэнтры: іённай імплантацыі і фізічных вымярэнняў, на хімічным — лабараторыя хімічнай фізікі.

Пачынаючы з 1961 года мы рыхтуем спецыялістаў і для многіх замежных краін. За гэты час універсітэт закончылі больш як паўтары тысячы замежных студэнтаў, аспірантаў і стажораў. Акрамя таго, 3,5 тысячы замежных навучэнцаў закончылі падрыхтоўчы факультэт.

Вышэйшая школа заклікана рыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў, памнажаць сілу савецкай навукі. Чэрвеньскі Пленум ЦК КПСС паставіў перад ёй і вялікія выхаваўчыя задачы. Да іх мы адносімся з усёй сур'ёзнасцю. Трывала ўвайшлі ў жыццё комплекснае планаванне выхаваўчай работы на ўвесь перыяд навучання, грамадска-палітычная практыка, факультэты грамадскіх прафесій, патрыятычны рух студэнцкіх будаўнічых атрадаў, Ленінскі залік. У адпаведнасці з рашэннямі чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС мы намячаем новыя мерапрыемствы па ўзмацненню нашай дзейнасці ў фарміраванні палітычных і грамадзянскіх, маральных якасцей студэнцкай моладзі. У выхаваўчай рабоце асаблівая ўвага будзе ўдзелена светапогляднаму станаўленню спецыялістаў, авалоданню імі матэрыялістычнай дыялектыкай як адзіна верным метадам пазнання і пераўтварэння свету, развіццю ў моладзі здольнасці з навуковых пазіцый ацэньваць з'явы грамадскага жыцця.

Такі ў агульных рысах Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна сёння. Яшчэ большыя натхняючыя яго перспектывы. Ён і надалей будзе развівацца як адзін з вядучых вучэбна-метадычных і навуковых цэнтраў нашай рэспублікі.

У нас ёсць усе падставы чакаць, што вы, першакурснікі, сваёй напружанай, мэтанакіраванай працай, актыўнай жыццёвай пазіцыяй з першага ж дня заняткаў заслужыце аўтарытэт і павагу ўсяго калектыву універсітэта.

**Л. КІСЯЛЕЎСКІ,**
**рэктар Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, акадэмік АН БССР.**

**МЫ — СТУДЭНТЫ!**

# УСЁ ЯШЧЭ НАПЕРАДЗЕ

ЧАС, КАЛІ ты быў абітурыентам, — цудоўная пара! Паўтара тыдня яна працягваецца, а колькі ўражанняў! Кожны з паступаючых марыць стаць студэнтам і кожны робіць усё, каб здзейсніць мару. Абітурыент хоча паказаць, што ён ведае, што яго выбар невыпадковы. Гэтыя паўтара тыдня становяцца часам надзей і трывог. Для Галі Глушчук і Светы Тамаровіч трывогі доўга не працягваліся і надзеі хутка спраўдзіліся. Абітурыенткі механіка-матэматычнага факультэта здалі асноўны экзамен на выдатна і сталі студэнткамі.

Калі мы сустрэліся з імі, яны былі радаснымі. Ужо лічылі сябе студэнтамі, але студэнцкае жыццё яшчэ было ім невядома. Дзяўчаты ўспамінаюць, як здавалі экзамен.

— А чаго баяцца, мы рыхтаваліся, — усміхаецца Галя. — Не так гэта і страшна, як гавораць.

Сапраўды, не так гэта і страшна. Але дзяўчаты таксама хваляваліся. Бо як бы ні падрыхтаваўся, на экзамене ўсякае можа быць, а тут такі адказны момант.

І Света, і Галя даўно марылі стаць настаўніцамі. Як прызналася Света, яна яшчэ з трэцяга класа палюбіла гэтую прафесію. Абедзве спынілі свой выбар на матэматыцы, любяць гэты прадмет. Хаця на адной матэматыцы не замыкаюцца: захапляюцца літаратурай і мовай. Прафесія настаўніка на працягу дзесяці гадоў вучобы ў школе была ў іх перад вачыма, многае яны ведаюць аб ёй. Таму і вырашылі паступаць у БДУ імя У. І. Леніна на педагагічны паток. Чаму ва універсітэт? Дзяўчаты лічаць, што тут можна набыць глыбокія веды ў галіне матэматыкі.

— Універсітэт выбрала сама, — гаворыць Галіна Тамаровіч. — Думаю, што не памылілася.

— Я сама з Нясвіжа, — падхоплівае размову Света. — Да нас у школу прыязджалі студэнты універсітэта, расказвалі пра БДУ імя У. І. Леніна, запрашалі паступаць. І я вырашыла падаць дакументы.

Дзяўчаты прызналіся, што многа чыталі пра універсітэт у газетах, часопісах, даведніках, завочна знаёміліся з ім. Тады ён стаў іх марай.

— Галя, што ты ведаеш аб мехмаце? — перапытвае Света.

На момант усталёўваецца цішыня.

— Што гэта добры факультэт! — адказваюць у адзін голас.

Так, ім давядзецца ўсё даведацца аб факультэце праз пэўны час, калі стануць паўнапраўнымі членамі калектыву. Ужо ў час уступных экзаменаў Света і Галя знайшлі сабе шмат сяброў. Безумоўна, многія з іх будуць вучыцца потым на мехмаце. Ды і самі дзяўчаты падружыліся іменна тут.

І зараз ім усё цікава: хочацца больш даведацца аб прадметах, якія будуць вывучаць, выкладчыках, кафедрах, інтэрнаце. Яны пакуль што не зусім уяўляюць сваю будучую дзейнасць, але ведаюць, што вучыцца будзе нялёгка.

— Што патрэбна, каб добра вучыцца? — вочы ў Галі запытальна ўскінуліся ўверх. — Трэба многа працаваць, напэўна...

— Стаpанне, уседлівасць і, зразумела, тваё жаданне, — дадае Света.

У іх ёсць невялікі вопыт — школу яны закончылі з залатым медалём.

Першую прыступку яны пераадолелі, а іх за час вучобы будзе шмат. Але ж і ў Светы Глушчук і ў Галі Тамаровіч, як і ў астатніх цяперашніх першакурснікаў, вялікае жаданне пераадолець усе цяжкасці.

**У. АБРАМОВІЧ,**
**наш кар.**

# АБІТУРЫЕНЦКІ



АЛЕ Ж І ЦЯЖКІМ было для цябе гэтае лета. Напэўна, спытай у цябе, і не адкажаш, ці многа было сонечных дзён, ці шчодрым на грыбы і суніцы быў лес, ці гаманіла прываблівым сваім голасам з дзяцінства знаёмая рачулка. Але затое з вялікай доляй упэўненасці адкажаш на самыя складаныя пытанні з курса фізікі сярэдняй школы, за хвіліну сарыентуешся ў моры хімічных формул, без памылкі назавеш год нараджэння Аляксандра Блока, з лёгкасцю прыпомніш два-тры эпіграфы да сачынення на вольную тэму...

Зараз, калі твой абітурыенцкі лёс ужо шчасліва вырашыўся, ты, крыху выхваляючыся перад малодшымі сябрамі, маеш права сказаць: «Экзамены... Так, экзамены — гэта не проста. Але не такі страшны чорт, як яго малююць»,— потым стомлена ўздыхнуць і з выглядам чалавека, які нямала пабачыў на сваім веку, пачаць расказ пра тое, як трапіўся «шчаслівы» білет, а экзаменатар пачаў задаваць безліч дадатковых пытанняў, як ты з перапуду замест англійскай мовы сунуўся было здаваць французскую, як аднойчы здалося, што няма ўжо больш сіл і прыйшоў твой канец, а гэта быў толькі пачатак таго марафона, што завецца ўступнымі экзаменамі...

Колькі варыяцый на экза-



# З КЛОПАТАМ АБ ПЕРШАКУРСНІКУ

**НАПЯРЭДАДНІ НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА НАШ КАРЭСПАНДЭНТ Н. КАЛІШЭВІЧ РАЗМАЎЛЯЕ З АДКАЗНЫМ САКРАТАРОМ ПРЫЁМНАЙ КАМІСІІ ПРАФЕСАРАМ У. П. ГОЛЬЦАВЫМ.**

**— Звычайна дзейнасць прыёмнай камісіі актывізуецца ў «час пік», калі універсітэт знаходзіцца пад уладай доўгачаканага і патрабавальнага госця, які марыць стаць тут гаспадаром, — абітурыента. І часта складваецца ўражанне, што праца прыёмнай камісіі абмяжоўваецца толькі гэтымі — летнімі — рамкамі. Ці так гэта?**

— Калі б гэта было так, мы рызыкавалі б апынуцца ў вельмі незайздросным становішчы. Лепш рыхтаваць сані летам, і таму, чым раней уключыцца камісія ў работу, тым больш арганізавана пройдзе напружаны і адказны перыяд прыёму.

Універсітэцкая прыёмная камісія-83 пачала працаваць з верасня мінулага года. Быў складзены каляндарны план мерапрыемстваў, крыху пазней зацверджаны састаў камісіі, у якую ўвайшлі прарэктары універсітэта, дэканы факультэтаў, прадстаўнікі універсітэцкіх і раённых партыйных і грамадскіх арганізацый, сфарміраваны тэхнічны сакратарыят. Гэта што датычыцца арганізацыі. Уласна, работа камісіі ў той час была накіравана ў асноўным на прафесійную арыентацыю будучых абітурыентаў.

**— Ужо, напэўна, можна падвесці першыя вынікі?**

— Самы важкі вынік—гэта 3,5 тысячы заяў на дзённае аддзяленне. Калі ўлічваць агульны дэмаграфічны спад, лічба нядрэнная. Да таго ж, больш за тысячу абітурыентаў прыйшлі да нас пасля выдатнага заканчэння школы ці вучылішча.

**— І наколькі іх веды адпавядалі тым адзнакам, што стаялі ў атэстатах і «чырвоных» дыпломах?**

— Гэта тэма для асобнай гутаркі, але скажу, што сярод медалістаў каля 70—80 працэнтаў пацвердзілі высокі ўзровень ведаў. Горш справы ў тых, хто мае дыплом з адзнакай. Толькі 20—30 працэнтаў з іх дастойна вытрымалі экзамены.

**— Факт трыаожны. Чым, на ваш погляд, гэта тлумачыцца?**

# МАРАФОН

## ФОТАРЭПАРТАЖ З УСТУПНЫХ ЭКЗАМЕНАЎ

менацыйныя тэмы можна пачуць у канцы жніўня! Колькі самых неверагодных баек, трагічных і камічных гісторый перадаецца з вуснаў у вусны ў гэты, ужо вольны ад турбот і хваляванняў, час! І ўсё здаецца не такім ужо цяжкім, трывогі адыходзяць на другі план, і нехта ўжо, у радаснай мітусні, забывае, што на самай справе ўсё было некалькі інакш. Менш гумарыстычна і больш сур'ёзна.

Былі мамы і таты, якія настойліва асаджвалі універсітэцкія дзверы у дарэмнай надзеі хоць што-небудзь даведацца аб лёсе сваіх дзяцей. Былі слёзы і крыўды. Маўляў, усё ведаў, але разгубіўся... Былі бяссонныя ночы і надакучлівыя старонкі падручніка. Але ўсё гэта ўжо ў мінулым, аб якім напамінаюць здымкі, зробленыя ў час уступных экзаменаў. Табе, пераадолеўшаму чаканыя і нечаканыя абітурыенцкія цяжкасці, яны будуць добрым напамінкам аб годзе 1983-м, аб часе, калі ты з гонарам назваў сябе студэнтам Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Цяжкім было для цябе гэтае лета. Але ж і шчаслівым. Хай і далей спадарожнічае табе, першакурснік, поспех. І можа праз пяць хуткіх студэнцкіх гадоў табе трапіцца ў рукі гэты газетны аркуш і ты пазнаеш і не пазнаеш сябе цяперашняга. Усміхнешся і шчыра пажадаеш поспехаў тым, хто прыйдзе пасля цябе.

**Н. АЛЕГАВА,**
**наш кар.**

Фота **В. Шачака.**





— Не бяруся сцвярджаць, але, магчыма, і жаданнем пайсці па шляху найменшага супраціўлення. Справа ў тым, што ў вучылішчах вялікую ўвагу ўдзяляюць прадметам спецыяльным і часта не вельмі зважаюць на агульнаадукацыйныя. Гэта можа прывесці да зніжэння якасці дыплома, а права на здачу толькі аднаго экзамена захаваецца. Вось цяпер і мяркуйце, што лягчэй, рыхтавацца да аднаго ці да чатырох экзаменацыйных адказаў? Я не заяўляю катэгарычна, што любы выдатна скончыўшы ПТВ падрыхтаваны горш за школьнага медаліста, але на практыцы так атрымліваецца часцей, чым хацелася б. З кожным годам колькасць паступаючых ва універсітэт «чырванадыпломнікаў» расце, таму самы час звярнуць увагу на гэтую акалічнасць.

**— А які з факультэтаў быў на гэты раз самым папулярным!**

— «Лесвіца папулярнасці» ў гэтым годзе выглядае так: першым стаіць гістарычны факультэт, конкурс на які быў больш за шэсць чалавек на месца. Другім — юрыдычны факультэт, спецыяльнасць правазнаўства (4 чалавекі), потым ідуць біяфак, філфак і, што асабліва радасна адзначыць, пасля некалькіх гадоў зацішша — фізфак. Конкурс на гэтых факультэтах складае 2—3 чалавекі на месца.

**— І ў чым прычына аднаўлення папулярнасці фізічнага факультэта!**

— Упершыню на спецыяльнасці фізфака быў адкрыты прыём па эксперыменту, гэта значыць са здачай двух экзаменаў пры наяўнасці сярэдняга бала атэстата не менш як 4,5.

**— Як вы ацэньваеце агульны ўзровень падрыхтоўкі абітурыента-83!**

— Станоўча. Аб гэтым сведчаць прахадныя балы, дарэчы, даволі высокія: правазнаўства — 25, гістарычны факультэт — 23,5, хімічны — 22,5...

**— А які з экзаменаў стаў для многіх каменем спатыкнення!**

— Як і звычайна, асаблівыя цяжкасці выклікалі пісьмовыя работы. Яны патрабуюць вялікай уважлівасці, умення мабілізавацца, дакладна размеркаваць адведзены час. Магчыма, гэтага і не хапіла некаторым абітурыентам.

**— І апошняе, традыцыйнае пытанне. Вашы пажаданні маладому папаўненню!**

— Баюся, што ў віхуры радасных віншаванняў яны прагучаць залішне цвяроза, але ўсё ж скажу — не расслабляйцеся. Першую прыступку вы пераадолелі, аднак яна яшчэ была не самай цяжкай.

## ВЫПУСКНІК-83 — ПЕРШАКУРСНІКУ-83

# «Памнажайце традыцыі сваіх папярэднікаў»

Я, НАПЭЎНА, як і кожны дзесяцікласнік, марыла паступіць у ВНУ. Хацела стаць настаўніцай. Адразу ж пасля школы падалася на філалагічны факультэт універсітэта. Ды толькі мая запаветная мара збылася аж праз чатыры гады. За гэты час я ўжо паспрабавала, як кажуць, настаўніцкага хлеба. Упэўнілася, што нялёгкі ён. Але не адступіла, не здрадзіла сваёй мары, а толькі яшчэ лепш зразумела, што няма больш адказнай справы, чым вучыць дзяцей. І як прыемна бачыць, што твае намаганні не страчаны дарэмна.

Тым, хто замяніў нас (зараз ужо не пяцікурснікаў, а маладых спецыялістаў) у аўдыторыі, хачу пажадаць, каб іх ніколі не наведала думка, што настаўнік — гэта не іх прызванне (я ўпэўнена, што вы ўзважылі ўсе «за» і «супраць», перш чым адчыніць дзверы БДУ). Будзьце працалюбівымі, настойлівымі. Вам не толькі працягваць нашы традыцыі, але і памнажаць іх.

**Галіна КУЗЬМІЦКАЯ,**
**выпускніца філалагічнага факультэта.**

# «БУДЗЬЦЕ САМАСТОЙНЫМІ»

ПАВАЖАНЫ ПЕРШАКУРСНІК! Дазволь павіншаваць цябе яшчэ раз. Я ўпэўнена, што ты атрымаў ужо безліч сардэчных пажаданняў. Сёння ты упершыню пераступіў парог БДУ і, напэўна, разгубіўся: з чаго пачаць, як зарэкамендаваць сябе добрым студэнтам? Перш за ўсё працуй. Настойліва і ўпарта. Толькі добрасумленнай працай можна дасягнуць пастаўленай мэты. І няхай ніколі не пройдзе тваё натхненне. Па-другое. Наладзь трывалыя і дзелавыя адносіны са студэнтамі старэйшых курсаў. Яны заўсёды прыйдуць на дапамогу, падзеляцца вопытам. Абавязкова шукай сяброў у групе.

Займайся навукай. Удзельнічай у грамадскай рабоце. Але выконвай усе даручэнні не «абы з рук», а творча, тады і табе і тваім таварышам будзе цікава. Не чакай, што нехта зробіць тваё жыццё разнастайным. Стварай усе ўмовы для сябе сам. Будзь самастойным.

І апошняе. Зразумела, у першыя дні вучобы выседзець шэсць гадзін на лекцыях і практычных занятках і засвойваць усё тое, што гавораць выкладчыкі, цяжкавата. Але не здавайся. Пераадолей сябе раз, другі, і гэта ўвойдзе ў тваю звычку, стане нормай.

**Ірына КУКЛІЦКАЯ,**
**выпускніца філалагічнага факультэта.**

# «ДЗЯКУЙ ТАБЕ, УНІВЕРСІТЭТ»

ПЯЦЬ ГАДОЎ НАЗАД мы, цяперашнія выпускнікі, пераступілі парог Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Засталіся ў мінулым — зараз гэта асабліва востра ўсведамляеш — студэнцкія гады. Хутка пранесліся яны, хутчэй, чым хацелася б. Якім кароткім здаецца зараз шлях ад першай сесіі да дзяржаўных экзаменаў. Незаўважна для сябе мы сталелі, пераходзячы з курса на курс. Вось і прыйшоў час задумацца, што даў нам універсітэт, чым сталі для нас пяць студэнцкіх гадоў.

Самае галоўнае для нас, зразумела, прафесійная падрыхтоўка. Нельга спадзявацца, што, завучыўшы тыя гатовыя ісціны, якія выкладаюцца лектарам, не адчуўшы радасці ад самастойнага пазнання новага, не навучыўшыся пераадольваць першыя цяжкасці і аналізаваць няўдачы, можна стаць кваліфікаваным спецыялістам. І таму я ўпэўнены, што шлях у навуку і на вытворчасць павінен абавязкова праходзіць праз студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі, якіх нямала ва універсітэце.

Зразумела, многае залежыць ад твайго навуковага кіраўніка. Гэта чалавек, у якога вучні пераймаюць не толькі прафесійныя навыкі, але і агульначалавечыя якасці, маральныя прынцыпы. З асаблівай цеплынёй успамінаю я выкладчыкаў, якія сталі для многіх з нас, выпускнікоў факультэта радыёфізікі і электронікі, першымі навуковымі кіраўнікамі. Сярод іх загадчык кафедры радыёфізікі прафесар А. М. Шырокаў, дацэнты Я. І. Боўбель, Л. Р. Кірыла, У. І. Мікуловіч. У іх вучыліся мы любві да сваёй прафесіі, сумленнасці, прынцыповасці.

Я лічу, што мне пашанцавала: маёй першай навуковай работай кіраваў цудоўны чалавек і вучоны прафесар У. В. Ізох. У яго я атрымаў тыя асновы прафесійнай падрыхтоўкі, якія зараз уяўляюцца мне найбольш значнымі. Уладзімір Васільевіч выхоўваў у сваіх вучняў самастойнасць, уменне не баяцца цяжкасцей, пераадольваць іх.

І яшчэ аб адным аспекце складанага працэсу падрыхтоўкі маладых спецыялістаў хочацца мне сказаць. Дзейнасць выпускніка ВНУ зараз немагчыма ўявіць сабе ў рамках вузкай спецыяльнасці. Для маладых спецыялістаў універсітэт становіцца не толькі першай прыступкай да прафесійнага росту, але і першым крокам да грамадзянскай сталасці. Жыццё патрабуе ад нас глыбокіх перакананняў, умення адстойваць іх і, самае галоўнае, умення жыць і працаваць у адпаведнасці з гэтымі перакананнямі. Усе гэтыя якасці немагчыма набыць, не ўдзельнічаючы ў грамадскай рабоце, у камсамольскім жыцці групы, факультэта, універсітэта.

Мне давялося быць камсоргам групы, намеснікам сакратара камітэта камсамола факультэта, кіраўніком прэс-цэнтра камітэта камсамола універсітэта, працаваць з такімі цудоўнымі камсамольскімі важакамі, як А. Рухля, А. Казулін, А. Нежавец, А. Чулкоў, І. Андрушкевіч. Цяжка пераацаніць тое, што дала мне камсамольская работа. Але асабліва запомніліся мне летнія месяцы 1982 года, калі СБА імя Герояў цаліны, камандзірам якога я быў, працаваў на будоўлі. Мы ведаем, як патрэбны зараз такія атрады, і таму я шчаслівы, што камуністычны СБА імя Герояў цаліны працягвае працаваць на студэнцкіх будоўлях 1983 года.

Многае можна прыпомніць: за пяць гадоў нямала было радасных і шчаслівых хвілін. І хоць я не развітваюся з універсітэтам — працаваць буду на кафедры радыёфізікі БДУ, — але студэнцкія гады, зразумела, ні з чым нельга параўнаць. А свае пачуцці я, бадай, выкажу адной фразай: «Дзякуй табе, універсітэт!»

**Юрый ВАРАТНІЦКІ,**
**выпускнік факультэта радыёфізікі і электронікі.**

# МЫ — «ВОЛАТЫ»

*НА ЗДЫМКАХ вы бачыце моманты з жыцця інтэрнацыянальнага будатрада «Волаты», які быў сфарміраваны на базе механіка-матэматычнага факультэта і базіраваўся ў Усць-Ілімску. Рабяты не толькі добра працавалі на будаўніцтве лесапрамысловага комплексу.*

*У вольны час — экскурсіі па гораду, паездкі ў падшэфны піянерскі лагер «Ілім». Хіба можна забыць алею дружбы, якую пасадзілі будатрадаўцы разам з піянерамі, антываенны мітынг пры святле факелаў на галоўнай пляцоўцы лагера! Арманда Рамірас сказаў тады: «З дзецьмі вельмі прыемна размаўляць — яны заўсёды прама глядзяць у вочы».*



*Надоўга застанецца ў памяці сустрэча з першапраходцамі гэтых мясцін, якія высадзіліся сюды, каб пачаць будаўніцтва Усць-Ілімскай ГЭС. Сядзелі мы тады сціснуўшыся, а на экране ўзнікалі кадры: Ангара да будаўніцтва плаціны, першая палатка, катлаван, першы магазін. І напэўна кожны з нас думаў: як шкада, што мяне тут у той час не было.*

*Шмат цікавых мерапрыемстваў было праведзена ў атрадзе, але, зразумела, самае галоўнае, самае важнае — работа. Што ні гаварыце, а працаваць мы ўмеем. Майстар даваў аб'ём работы і гаварыў: зрабіць да вечара. Праз гадзіны дзве прыходзіў і ад здзіўлення разводзіў рукамі — усё было ўжо гатова.*

*Дзесьці я чуў: шчасце — гэта калі табе раніцай хочацца на работу, а вечарам — дадому. Мне здаецца, гэтыя два месяцы былі шчаслівыя і для студэнта юрфака Уладзіміра Някрашэвіча, і для нямецкіх студэнтаў Андрэаса Элі і Інгольфа Бэма. Не прайшлі яны дарэмна і для ўсіх астатніх байцоў інтэрнацыянальнага будаўнічага атрада «Волаты».*

С. ПЛЫТКЕВІЧ,
баец СБА «Волаты».

НА ЗДЫМКАХ: студэнты з ГДР Андрэас Элі і Інгольф Бэм на аб'екце; Уладзімір Някрашэвіч задаволены вынікамі працоўнага дня; Арманда Рамірас гутарыць з піянерамі.

Фота аўтара.





# 20 хвілін язды да адкрыццяў

**...Мы хутка пагрузілі ў аўтобус свае рэчы і крануліся ў дарогу. Без усялякай дарожнай рамантыкі, за 20 мінут даехалі да месца дыслакацыі, у саўгас «Мінская гароднінная фабрыка». Тыя, хто бачыў сябе ў марах у байцоўскай форме абавязкова ў далёкіх краях, зразумела, былі крыху расчараваны. Няўтульная спартыўная зала з голымі сценамі — наша жыллё — таксама не выклікала бадзёрага настрою.**

А сёння той першы дзень здаецца вельмі далёкім, і ўсе мы цвёрда ведаем, што дружнаму, згуртаванаму калектыву ўсё пад сілу.

Добраўпарадкавалі, зрабілі ўтульным наша жыллё. Работа з галавой уцягнула ў свой кругаварот: праполка гародніны, уборка укропу, бульбы, капусты... Захапіліся справай. А пасля працоўнага дня таксама не сядзелі, склаўшы рукі.

Мы правялі ў атрадзе анкету, адным з пытанняў якой было наступнае: «Які дзень у атрадзе спадабаўся табе больш за ўсё?» Адказы атрымалі розныя, а большасць — з прыпіскай: «Увогуле кожны дзень своеасаблівы і цікавы па-свойму».

З вялікім стараннем збіралі нашы дзяўчаты лекавыя травы. У «баявым лістку» ад 25 ліпеня, напрыклад, адзначана, што атрадам здадзена ў аптэку 23 кілаграмы сушаных лекавых траў. Безумоўна, у гэтым вялікая заслуга нашага атраднага ўрача Галіны Ільінчык.

Многае зрабіла група «Доўг», якую ўзначальвала Ганна Хрол. Амаль кожны дзень накіроўваліся дзяўчаты ў вёскі Трасцянец і Сціклева, каб дапамагчы ветэранам, інвалідам, а з некім проста цікава пагутарыць, арганізаваць сустрэчу. Адна за другой запаўняліся старонкі «Летапісу народнай славы».

Поспехам карысталася і наша агітбрыгада. Былі выступленні ў сельскім клубе, на палявым стане...

Упэўнена, што поспех у рабоце СБА залежыць не ад месца дыслакацыі, а ад таго, як наладжана работа ў атрадзе, наколькі здаровая атмасфера ў калектыве.

**А. БЯЛЯК,**
**камандзір СБА «Алеся» хімічнага факультэта.**

## ПІСЬМО ПАДЗЯКІ

# Рамантыкі ў буднях

З ПЕРОНА АДЭСКАГА вакзала адыходзіў пасажырскі поезд Адэса — Мінск. Горад праводзіў сваіх гасцей моцным ліўнем. Вядома, настрой у ад'язджаючых быў крыху сапсаваны. Але як прыемна было ў вагоне пачуць ветлівыя словы праваднiц.

Тут не было звычайнай чаргі. Хутка, уважліва правяралі дзяўчаты білеты, падбадзёрвалі вымакшых усмешкай, жартам, запрашаючы займаць свае месцы. Дапамагалі тым, хто затрымаўся ў дзвярах з рэчамі. Калі поезд крануўся, пастараліся хутчэй напаіць пасажыраў чаем, які здаўся нам смачней звычайнага.

Поезд часта спыняўся на станцыях, чакаючы сустрэчнага, і кожны раз дзяўчаты паведамлялі, колькі будзем стаяць, і папярэджвалі пасажыраў, каб не спазняліся.

Усё гэта ўваходзіла, напэўна, у звычайныя абавязкі праваднiц, але нашы дзяўчаты выконвалі іх з нейкай асаблівай добразычлівасцю і любоўю.

Як мы потым даведаліся, праваднiцамі былі студэнткі трэцяга курса механіка-матэматычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна Людміла Сарокіна і Ірына Прохарчык, якія ўмеюць быць рамантыкамі ў буднях.

Сёння хочацца сказаць дзяўчатам, а таксама тым, хто выхоўвае такіх людзей, вялікае дзякуй за старанне і дабрату.

**Н. АЛЯКСЕЕВА,**
**пасажыр поезда Адэса — Мінск.**

# ЭКЗАМЕН ВЫТРЫМАЛІ

**У камуністычным атрадзе імя XIX з'езда ВЛКСМ працавалі студэнты хімічнага факультэта. Месца работы — Ждановіцкі дзіцячы дом. Байцы выконвалі абавязкі выхавацеляў.**

У першыя дні работы ў дзіцячым доме байцы, зразумела, сутыкнуліся з цяжкасцямі. Пераадолець іх было справай нялёгкай. Патрэбна было знайсці з дзецьмі агульную мову, прывыкнуць да іх, заваяваць аўтарытэт і павагу.

Ішлі дні, паявіліся вопыт і ўпэўненасць. Працуючы выхавацелямі і начнымі нянькамі, байцы знаходзілі час і для многіх цікавых спраў. Арганізавалі гурток «Умелыя рукі», выстаўкі дзіцячага малюнка ў групах, зрабілі для дзяцей шмат мяккіх цацак, вырабаў з прыроднага матэрыялу, розных наглядных дапаможнікаў для заняткаў, рамантавалі дзіцячае адзенне, добраўпарадкавалі тэрыторыю дзіцячага дома. Былі пасаджаны кветкі, адноўлены пляцоўкі для гульняў.

Зробленыя грошы байцы пералічылі ў фонд дзіцячага дома.

...Закончыўшы свой працоўны семестр, студэнты са смуткам пакідалі дзіцячы дом. Байцы і іх падапечныя пасябравалі, і цяжка было развітвацца...

Ад усёй душы хочацца сказаць: «Малайцы, рабяты! Выпрабаванне вытрымалі на выдатна»!

Дарэчы, на адным з пасяджэнняў Мінскага занальнага штаба СБА прадстаўнікі іншых лінейных атрадаў выказалі жаданне таксама аказаць дапамогу Ждановіцкаму дзіцячаму дому. Байцы атрадаў, дыслакаваных у Мінскім раёне, сабралі для дзяцей шмат цацак і пісьмовых прыналежнасцей і перадалі ў дзіцячы дом.

**В. ДАРАФЕЕЎ,**
**камандзір Мінскага занальнага студэнцкага атрада.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

1 верасня 1983 г.

Зак. 1442 АТ 04405

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ